ДА ЛЕПШАЙ ДОЛІ, ЛЕПШАЙ СЛАВЫ
Янка Купала

Раённыя Будні

ОРГАН ПРУЖАНСКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ І РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

Газета выдаецца з кастрычніка 1939 года

10 студзеня 1998 г., субота

№3 (7554)

Кошт 1500 рублёў

Інфарм-калонка "РБ"

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

Раённы выканаўчы камітэт прыняў рашэнне ўзнагародзіць Граматай райвыканкома

за шматгадовую і добрасумленную працу, вялікі асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё раёна

КАЗАРЭЗА Івана Сяргеевіча — намесніка старшыні раённага выканаўчага камітэта.

УШАНАВАЛІ ПАМЯЦЬ ПАЛКАВОДЦА

Уладзімір ЛАБУДА

У адзін з суботніх вечароў шматлюдна было ў Шарашоўскім Доме культуры. На ўрачысты вечар, прысвечаны 101-й гадавіне з дня нараджэння выдатнага палкаводца Г.К.Жукава, былі запрошаны ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, а таксама жыхары пасёлка, моладзь, вучні мясцовай школы. На жаль, не ўсе ветэраны змаглі прысутнічаць на гэтым свяце.

З прывітальным словам да ветэранаў звярнуліся старшыня пасялковага Савета Н.А.Антановіч і намеснік дырэктара Шарашоўскай СШ В.Л.Дулько.

Наступае ўрачысты момант. Старшыня пасялковага Савета і старшыня савета ветэранскай арганізацыі уручаюць ветэранам медалі Г.К.Жукава і грашовыя прэміі.

На заканчэнне вечара адбыўся канцэрт, падрыхтаваны сіламі ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці Дома культуры і сярэдняй школы.

КАЎБАСЫ НА ВЫБАР

Аляксандр ПАНЮЦІЧ

Закончылася рэканструкцыя каўбаснага цэха камбіната кааператыўнай прамысловасці.

Старое, зношанае абсталяванне заменена новым айчынным і замежным — чэшскім. Цяпер тут выпускаецца да 15 найменняў каўбасных выробаў у змену, а на працягу месяца — да 20-ці.

Плануецца і надалей пашыраць асартымент. У прыватнасці, наладзіць выраб сыравэнджаных каўбас.

РАДАСЦІ СУРОВЫХ БУДНЯЎ

Віталь МАЦВІЕНКА

Напярэдадні Новага года ўзорная эстрадная студыя ГДК пад кіраўніцтвам Я.Валанчуса выступіла з выязным канцэртам на пагранзаставе №1.

Пагранічнікі вельмі цёпла сустракалі ўсіх выканаўцаў. Аднак найбольшае захапленне выклікала выступленне самага юнага саліста студыі Юры Пракапца.

Потым гаспадары пазнаёмілі гасцей з механізмам затрымання парушальнікаў мяжы, паказалі прыёмы рукапашнага бою і элементы баявой стральбы.

"Мы яшчэ сустрэнемся з вамі",— спявалі на развітанне студыйцы. І, мяркуючы па рэакцыі пагранічнікаў, яны жадаюць таго ж.

КРЫМІНАЛУ НЕ БЫЛО

Анна ХАДАРОВІЧ

Як паведамілі карэспандэнту "Раённых будняў" у райаддзеле ўнутраных спраў, навагоднія святы сёлета прайшлі без асаблівых эксцэсаў, калі не лічыць некалькіх п'яных сямейных скандалаў.

Праўда, гэтыя дні не сталі выключэннем для аўтааварыйнасці. 2 студзеня ў 19.00 гадзін непадалёку ад Аранчыц вадзіцель БМВ збіў веласіпедыста, які ехаў пасярод шашы без святлавяртальніка. Веласіпедыст загінуў.

Па факту вядзецца следства.

Замежныя кантакты

ГАЛАНДЫЯ— КРАІНА НЕ ТОЛЬКІ ЦЮЛЬПАНАЎ

У КАНЦЫ СНЕЖНЯ група кіраўнікоў гаспадарак раёна на чале са старшынёй райвыканкома С.В.Тарасевічам наведала Галандыю.

Наш карэспандэнт сустрэўся з начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкома А.І.ЮРКЕВІЧАМ, які падзяліўся сваімі ўражаннямі.

Мікола АРХУЦІК

—Аляксандр Іванавіч, якая асноўная мэта гэтай паездкі?

—Візіт у Галандыю стаў як бы працягам папярэдняй паездкі ў гэтую краіну. Асноўная мэта візіту— больш дэталёва азнаёміцца з работай фермерскіх гаспадарак па вытворчасці малака і мяса, вывучыць магчымасці набыцця абсталявання для нашых малочнатаварных ферм і будаўніцтва іх з удзелам галандскіх фірм па сучаснай тэхналогіі. Цікавілі нас пытанні перапрацоўкі малака. Наведалі таксама камбікормавы завод, завод па вытворчасці насення траў, піўзавод.

—Як я разумею, Галандыя выбрана не выпадкова. У гэтай краіне ёсць чаму павучыцца нашым аграрнікам.

—Так. Галандыя—гэта краіна не толькі цюльпанаў, якой яна нам уяўляецца са школьных падручнікаў. Дарэчы, падчас паездкі гэтых кветак мы і не бачылі. Галандыя — гэта высокаразвітая аграрна-індустрыяльная еўрапейская краіна. Выдатных поспехаў дабілася галандцы ў развіцці аграрнага сектара. Так, толькі пагалоўе свіней дасягае 20 мільёнаў. Для краіны характэрны фермерскія гаспадаркі, адну з якіх мы і наведалі. Плошча фермерскага надзелу 80 гектараў, палова з якіх адведзена пад шматгадовыя травы. Астатнія 40 гектараў заняты прапашнымі, збожжавымі культурамі. На такой ферме на час нашай паездкі ўтрымлівалася 72 каровы, 88 цялят. За мінулы год атрымана 600 тон малака, 500 з якіх перапрацавана ва ўласным цэху. Тут жа знаходзіцца магазін, дзе прадукцыя рэалізуецца. Надой на карову дасягае 9 тысяч кілаграмаў у год, тлустасць малака—4,6%. У рацыёне кароў сянаж і сілас, камбікармы. Высокая ўраджайнасць сельгаскультур, вырошчваемых фермерскай гаспадаркай: бульбы сабрана па 550 цэнтнераў з гектара, цукровых буракоў—650, збожжавых для харчовых мэт—70 ц, фуражнага зерня—90 цэнтнераў з гектара. Працуюць на ферме 12 наёмных работнікаў, 40 гадзін у тыдзень. Сярэдняя зарплата кожнага з іх у год складае 30000 долараў.

Што больш за ўсё здзівіла, дык гэта аўтаматызацыя і камп'ютэрызацыя фермаў. Сянаж і сілас даюць жывёлам у поўным дастатку, хто колькі з'ядае. А вось камбікорм кожная жывёліна атрымлівае з улікам прадуктыўнасці. Кожная карова мае на шыі датчык, які выдае інфармацыю па жывёле. Датчык, які знаходзіцца на раздачы кармоў, счытвае інфармацыю з датчыка на шыі, і жывёла аўтаматычна атрымлівае пэўную колькасць кармоў.

З дойкай кароў спраўляецца на ферме адзін чалавек, каровы знаходзяцца без прывязі. Даенне — таксама пад кантролем камп'ютэра. Ён фіксуе колькасць і тлустасць малака, наяўнасць саматычных клетак і г.д. Затым з малака вырабляюць сыр.

На кожнай ферме — чысціня, уся арганіка захоўваецца ў гноесховішчах, якія, як правіла, знаходзяцца пад фермамі. Адзін раз у год яна адпампоўваецца і вывозіцца на палі. У Галандыі, дарэчы, існуе праблема ўтылізацыі гною.

Дальнае абсталяванне на фермах шведскае, але гэта ўжо лічыцца учарашнім днём. Цяпер папытам тут карыстаецца нямецкае абсталяванне.

—Аляксандр Іванавіч, што больш за ўсё Вас уразіла падчас паездкі?

—Трэба адзначыць, што клімат Галандыі адрозніваецца ад нашага. Калі ў нас сталі амаль трыццаціградусныя маразы, то там ноччу тэмпература не апускалася ніжэй 7 градусаў. Паша ў гэты час была зялёная. Цікавая дэталь: у Галандыі няма каларадскага жука, і бульбяныя палеткі тут не апрацоўваюць супраць гэтага шкодніка. А вось супраць фітафтарозу апрацоўка праводзіцца да 10 разоў.

На фермах працуюць у асноўным сем'ямі. Дакладна выконваецца тэхналогія закладкі сенажу і сіласу, здымаецца па 5-6 укосаў траў. Зялёная маса моцна здрабняецца. Што яшчэ больш за ўсё уразіла—гэта выключная чысціня. Трэба адзначыць яшчэ добразычлівасць галандцаў.

—Чытачам будзе цікава даведацца, якія ўсё ж дамоўленасці дасягнуты з галандскімі партнёрамі.

—Дасягнута папярэдняя дамоўленасць на будаўніцтва дзвюх фермаў на 200 галоў у калгасах імя Свярдлова і "Рассвет" па галандскай тэхналогіі з выкарыстаннем іх жа канструкцый, якія маюць высокія цеплаізаляцыйныя ўласцівасці. Таксама ёсць дагавор з фірмай "Вестфалія" на пастаўку дальнага абсталявання для іх. Дарэчы, гэта фірма мантуе абсталяванне і затым абслугоўвае яго на працягу ўсяго тэрміну эксплуатацыі.

У раёне востра стаіць пытанне набыцця дальных стаканаў. У гэтай жа фірмы плануем закупіць партыю такіх стаканаў з сіліконавым пакрыццём, тэрмін эксплуатацыі якіх дасягае двух гадоў. Зацікавіла нас абсталяванне для забору сіласу з траншэй. Такі агрэгат можна навесіць на любы наш трактар. Ён адразу адразае блокі сіласу і даставіе іх у кароўнік. Калгасы "Рассвет" і імя Свярдлова плануюць набыць такія агрэгаты. Падчас наведвання завода па вытворчасці насення таксама дасягнуты пэўныя дамоўленасці. Мы гатовы ім даць свае зямельныя плошчы, а яны няхай ідуць да нас са сваім насеннем. Гэта, дарэчы, датычыцца і кукурузы.

А ўвогуле з усяго ўбачанага можна зрабіць адзін вывад: нам патрэбна ў жывёлагадоўлі на перспектыву ісці па шляху аўтаматызацыі і камп'ютэрызацыі фермаў, іншага шляху тут няма.

ДЛЯ ДАВЕДКІ: Галандыя (Нідэрланды)—краіна ў заходняй частцы Еўропы. На захадзе і поўначы амываецца Паўночным морам. На ўсходзе мяжуе з Германіяй, на поўдні — з Бельгіяй. Сталіца—горад Амстэрдам. Плошча краіны 41 тысяча кв. кіламетраў. Насельніцтва—16 мільёнаў чалавек (плошча Брэсцкай вобласці—32,8 тыс. кв. кіламетраў, насельніцтва—1,5 мільёна чалавек).

Умей круціцца!

ВАС ЧАКАЕ "АДОНІС"!

Пасля амаль гадавога перапынку адчыніў свае дзверы магазін "Адоніс" на вуліцы Сацыялістычнай у Пружанах. У былыя гады ён быў папулярным у гараджан. На прэзентацыі абноўленага "Адоніса" прысутнічала і гутарыла з прадаўцом Н.С.РАДЗІВОНЧЫК карэспандэнт "Раённых будняў".

—Ніна Сцяпанаўна, "Адоніс" быў так доўга зачынены, што мы, пакупнікі, ужо і надзею страцілі.

—У магазіне праходзіў капітальны рамонт. Цяпер ён пераабсталяваны пад рэалізацыю прамысловых тавараў, а дакладней, абутку.

—Значыць, пружанскім модніцам і моднікам пашчасціць набыць у вас туфлі і чаравікі?

—Мы будзем гандляваць абуткам як айчыннай вытворчасці, так і фабрык, працуючых сумесна з замежнымі фірмамі. "Адоніс" заключыў кантракт на пастаўку абутку з беларуска-нямецкай фабрыкай "Марка" ў Віцебску. Галоўная перавага чыста скуранога абутку "Марка" — лёгкасць, камфорт і надзейнасць. Ужо ёсць дамоўленасць на пастаўку абутку з Мінска з сумеснай беларуска-кіпрскай фабрыкі "Рэйліт". Завязаны дзелавыя адносіны з "Белкельмі" — сумесным беларуска-іспанскім прадпрыемствам, абутак якой славіцца тым, што не баіцца вільгаці.

—Спадзяемся, цэны ў магазіне будуць прымальны і для раённага журналіста?

—Мы самі зацікаўлены ў тым, каб цэны ў "Адонісе" былі як мага ніжэйшыя. Нам патрэбны хуткі тавараабарот і шмат пакупнікоў. Разам з высокай якасцю тавару і адпаведнай культурай абслугоўвання гэта павінна прынесці фірме поспех і дастатак.

—Яшчэ што-небудзь, акрамя абутку, магазін нам прапануе?

—Будзем прадаваць ніткі санкт-пецярбургскай фабрыкі "Красная нить", тканіну рознага асартыменту, у тым ліку для абіўкі мэблі, ёсць скуразамяняльнік. Маем у продажы танныя тэлефонныя апараты, наручныя гадзіннікі Мінскай фабрыкі "Электроніка", а таксама касметыку для жанчын. Дарэчы, усе тавары ў нашым магазіне маюць сертыфікат якасці. Думаю, гэта немалаважна ведаць пакупніку. Гарантуем, што ў "Адонісе" вы купіце высакаякасны і разам з тым недарагі тавар.

Мы вас чакаем штодзень, акрамя панядзелка, з 10.00 да 18.00 гадзін, а ў суботу і нядзелю — з 10.00 да 14.00 гадзін.

Інтэрв'ю ўзяла Анна ХАДАРОВІЧ.

Удакладненне

У апошнім нумары газеты за мінулы год у інфармацыі аб ураджайнасці сельгаскультур у гаспадарках раёна допушчана недакладнасць: па з/базе "Белавусаўшчына" адсутнічаюць звесткі па брыгадзе №3 (брыгадзір М.С.Кот). Трэба чытаць: ураджайнасць (ц/га) збожжавых і зернебабовых—28,6, бульбы—219, кармавых караняплодаў—400.

Ёсць пытанне!

Гэта рамонт ці проста так?

Камунальнікі ці дарожнікі (дакладна не ведаем, хто) паднеслі нам, жыхарам вуліцы Вінаградава ў Пружанах, да навагодніх свят падарунак: навазілі кучы зямлі ды так і пакінулі. Да гэтага часу яны мазоляць вочы.

Са званка ў рэдакцыю.

Растлумачыць сітуацыю мы папрасілі загадчыка аддзела па кіраванню гарадской гаспадаркай А.У.ЮКА:

—Хацелі, як лепш, а атрымалася, як заўсёды,— пажартаваў ён. —А калі сур'ёзна, то аналагічнае становішча і на вуліцах Паркавай, Камсамольскай, Ціхай... Завезлі сюды гравій на падсыпку, а тут стукнулі маразы. Тыя кучы так замёрзлі, што нават зламаўся грэйдэр, які прыехаў іх разраўняць, калі пачалася адліга. Будзем спадзявацца, што адліга пратрымаецца, і ў бліжэйшы час справа даробіцца.

Чаму ў горадзе вянчацца танней?

Хто і як устанаўлівае сумы разлікаў за розныя абрады ў царкве і чаму ў розных месяцах яны розныя?

Са званка ў рэдакцыю.

Адказаць на пытанне мы папрасілі благачыннага Пружанскага сабора Аляксандра Неўскага айца Уладзіміра. Вось што ён паведаміў:

—Па прэйскуранту, які штогод зацвярджае ўсім царкоўным прыходам епархія, за вянчанне належыць плаціць 500 тысяч рублёў, за пахаванне — 300 тысяч, за хрышчэнне — 200 тысяч, за паміханне на год — 200 тысяч і г.д. Адным словам, устаноўлены цвёрдыя расцэнкі. Аднак у горадзе мы іх знізілі: людзей у царкву ходзіць многа. Пахаванне каштуе ў нас, напрыклад, 200 тысяч, хрышчэнне — 150 тысяч, вянчанне — 250 тысяч. Па гэтай прычыне сельскія святары, здараецца, нават крыўдуюць на горад: маўляў, збіваеце цэны. Яны на месяцах могуць устанавіць свае, большыя за ўказаныя ў прэйскурантах расцэнкі. Лічыцца, што робіцца гэта па ўзгадненню з прыхаджанамі для развіцця прыходу. Хаця ўвогуле такое павышэнне цэн мы не адабраем. У студзені якраз адбудзецца нарада па гэтаму пытанню.



У "Раённых буднях" у новым годзе з'явіўся добраахвотны памочнік — вось гэты чалавечак. Ён вырашыў дапамагчы журналістам працаваць з вашымі пісьмамі, шаноўныя чытачы. На першы погляд, ён сціплы і сарамлівы, але — разам з тым — здольны шчыра паспачуваць чужой бядзе, парадавацца шчасцю бліжняга свайго, а калі трэба — стаць на бок пакрыўджанага, быць прынцыповым і патрабавальным. А ініцыялы ён мае такія ж, як і наша газета — Р.Б., Рыгор Буднік.

Р.Б. чакае вашых пісьмаў і званкоў.

У мамы спрадвеку ручная душа.
І як адухоўлены рукі ў мамы!
Да іх нам з жыццёвых
вандровак спяшаць,
Пакуль не паклічуць
жальбой тэлеграмы.
Леанід ГАЛУБОВІЧ.

Не забыліся пра пенсіянераў

Многія з нас, як, напрыклад, Сцепаніда Саўчук, Марыя Корсак, Валянціна Фарафонава, Кацярына Гарбузава, Ніна Місюля, Марыя Люкевіч, Марыя Вашкевіч і іншыя, па 20 — 30 гадоў працавалі ў Брэсцкай абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі. Мы даўно ўжо на заслужаным адпачынку. І нам вельмі прыемна, што адміністрацыя станцыі, прафсаюзная арганізацыя, нашы калегі па рабоце не забываюць нас. Вось і сёлета ў Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу ўсіх пенсіянераў запрасілі на святочны "агеньчык". Кожнаму ўручылі грашовую дапамогу. А перад Новым годам нас зноў павіншавалі і ўручылі канверты з грашыма. Новы дырэктар Тамара Фамінічна Лукуць доўгі час працавала з намі і ведае нашы патрэбы. Таму і не дзіўна, што нягледзячы на фінансавыя цяжкасці, яна знайшла магчымасць аказаць нам матэрыяльную дапамогу. Ад усёй душы мы шчыра дзякуем Тамары Фамінічне і прафсаюзнай арганізацыі на чале з Вольгай Барысюк за тое, што яны не забыліся пра нас, пенсіянераў.

Соф'я КАРПЕЙ, пенсіянерка.

СПАЗНЯЕМСЯ!

Тры дні на тыдзень едзем з Белавусаўшчыны на працу на Магілявецкім ці Скорцаўскім аўтобусах. Прыязджаем у Пружаны яшчэ да 8.00 гадзін. А ў сераду і чацвер Навасёлкаўскі аўтобус спыняецца ля нас амаль у 9.00 гадзін. Пакуль дабярэшся на работу — ужо і палова дзесятай.

Просьба да адміністрацыі аўтапарка №11 перагледзець расклад руху. Нас, такіх, хто ранкам спяшаецца ў Пружаны на работу, нямала.

Таіса АЛЕКСАНДРОВА.

Чырвонаармейская, 78
Пошта "РБ"

Сітуацыя

Гульні у "сапсаваны тэлефон"?

Шаноўная рэдакцыя! Звяртаюцца да цябе тэлефонныя абаненты, якіх абслугоўвае Байкоўская АТС.

Нам вельмі ўжо надакучыла гуляць у "сапсаваны тэлефон". Наша аўтаматычная тэлефонная станцыя вельмі любіць такія гульні: і тры абаненты можа злучыць разам, і чатыры, а "па блату" і пяць — гаварыце на здароўе. А то пагуляе ў "маўчанку". Умовы гэтай гульні ўсім вядомыя: з таго боку выклік будзе, а на другім канцы провада — цішыня. Цікава, праўда?

Скардзіліся мы сваім пружанскім майстрам – не верашь, кажуць, што мы ўсё выдумляем. Дакладвалі раённаму начальству. Мабыць, і там не вераць, бо няма ніякага адказу. Хаця грошы з нас яны бяруць спраўна.

Праўда, адночы прыязджалі да нас па "тэлефоннай справе" тры прыгожыя жанчыны з раённага вузла электрасувязі. Паглядзелі і далі пісьмовы адказ на нашы скаргі: "...у сувязі з тым, што на станцыі ўводзяцца новыя нумары, будуць зрывы размоў, дрэнная работа тэлефонаў" і г.д.

Але ж, даруйце, мы – "старыя" абаненты і не памятаем, каб наша станцыя калі-небудзь працавала лепш. Ці можа там увесь час уводзяцца новыя нумары? І чаму мы павінны пераживаць непрыемнасці па прычыне нас нецікавай і ад нас незалежнай? Плацім жа мы за добрую работу тэлефонаў. А калі так, дык няхай нам знізяць абанементную плату на час таго "абкату" станцыі.

Дапамажы нам у нашай бядзе. А то мы апошнія нервы страцім з такімі тэлефонамі.

Н.БАРЫСЕВІЧ, В.ДАВІДЗЕНКА і яшчэ чатыры подпісы абанентаў Байкоўскай АТС.

Раскажу аб чалавеку

Сапраўдных прыгажунь шукайце... за прылаўкам

Вось ужо 30 гадоў я жыву ў вёсцы Варанілавічы. Вельмі многа работнікаў гандлю за гэты час праз наш невялікі сельскі магазін прайшло. А гады тры назад пачалі тут працаваць дзве Галіны. І наш магазін перайначыўся ва ўсіх адносінах. Загадчыца магазіна Галіна Рыгораўна Ахрамеля — з вялікім вопытам работы ў гандлі і да пары ёй — прадавец Галіна Міхайлаўна Баран. Чалавек, наведаўшы наш магазін, не выйдзе без пакупкі.

Прыгожыя дзяўчаты за прылаўкам, дастатковы асартымент тавараў, які не ўступае гарадскому магазіну, сардэчнае абыходжанне з пакупнікамі, слушная парада ў выбары тавару вабіць, кранае нават самага прыдзірлівага пакупніка. І гэта пункт гледжання не толькі жыхароў адной нашай вёскі, але і ўсіх калгаснікаў калгаса "Зара". Мы лічым, што сапраўдныя прыгажуні — гэта не толькі тыя дзяўчаты, якія выступаюць на подыумах Сашы Варламава. Зайдзіце ў наш магазін і вы ўбачавідкі пераканаецеся, што і ў нас у Варанілавічах ёсць свае каралевы прыгажосці.

І не толькі. Наведайце, напрыклад, магазін у вёсцы Каплі, які таксама знаходзіцца ў нашым калгасе. Тут вас таксама сустрэнуць добразычлівай усмешкай. Сімпатычны прадавец — гэта Тацціяна Іванаўна Макарэвіч. Працуе яна ў магазіне не так і многа, але паспела зарабіць у жыхароў вёскі павагу.

У сувязі з навагоднімі і каляднымі святамі ад імя нашых вяскоўцаў я хачу пажадаць гэтым цудоўным феям вялікага асабістага шчасця, удачы і творчасці ў нялёгкай рабоце. А Ружанскаму спажывтаварыству і надалей падбіраць такія кадры ў сферу абслугоўвання. Наша шэрае жыццё будзе намнога святлейшым, калі нас будуць усюды сустракаць шчырыя і прыветныя людзі.

Пётр МАСЛЁНКІН, жыхар вёскі Варанілавічы.

Перажылі хвіліны шчасця

ХВІЛІНЫ шчасця атрымалі тыя, хто наведаў чытальную залу раённай бібліятэкі, дзе адбыўся бенефіс актыўнага чытача раённай бібліятэкі Ружэны Яўгенаўны Саронкіной. Скупыя радкі яе біяграфіі. Любімы пісьменнік М.А.Булгакаў. Любімы твор "Собачье сердце". Любімыя спевакі Ала Пугачова і Валерый Лявонцьеў, фільмы — Леаніда Гайдая, хобі — рукадзелле. Пра сябе Ружэна Яўгенаўна расказвала сціпла, затое выстава прачытаных ёю кніг пазнаёміла нас з таленавітым настаўнікам, дастойным грамадзянінам і вылатным чалавекам.

Цяпер Р.Я.Сарокіна працуе намеснікам дырэктара сярэдняй школы №3 па выхаваўчай рабоце. Яна дае ўрокі сусветнай мастацкай культуры. Шматлікія інтарэсы чытачкі. Любіць яна паэзію, сентыментальныя раманы пра каханне і чалавечыя лёсы. Любімы адпачынак Ружэны Яўгенаўны — падарожжа па літаратурных мясцінах. Цікава было пабываць на Паўночным Каўказе, успомніць старонкі жыцця М.Ю. Лермантава, пабачыць, хоць бы і на слайдах, месца гібелі паэта...

Сумныя разважанні аб хуткацечнасці жыцця суправаджаў мелагучны царкоўны звон, як набат смутку аб заўчасна памерлых. Міжволі ўспомніліся словы Ф.М.Дастаеўскага: "Быць чалавекам заўсёды між людзьмі і застацца ім назаўсёды. у якіх бы то ні было няшчасцях не тужыць, не ўпасці — вось у чым жыццё, у чым задача яго".

Лідзія ПАНЬКО.

"Сонечны" юбілей

"20 гадоў — гэта ўжо не дзяцінства, але і яшчэ далёка не старасць",— так зазначыў на нядаўнім юбілейным для нашага Сонечнага Дома культуры вечары старшыня Пружанскага сельскага Савета У.А.Яцкевіч. Тым не менш, успамін на вечары было нямала — пра клуб, а разам з ім і бібліятэку. Таму што яны, як брат і сястра адной маці — культуры, заўсёды крочаць разам. Усім, напрыклад, было цікава даведацца, што самым першым бібліятэкарам у пасёлку Сонечны была Вера Феадосьеўна Зубко. У 1966 годзе 526 экземпляраў кніг бібліятэкі прыняла пад сваю апеку М.А. Вінаградава. 20 гадоў прысвяціла любімай рабоце ў бібліятэцы пасёлка Сонечны М.І.Мацвіенка. Цяпер гэтае званне з гонарам нясе А.І.Фасевіч – адна з пераможцаў раённага конкурсу "Лепшы па прафесіі" сярод бібліятэкараў.

А вось брацішку-клубу трошкі не пашанцавала. Яго кадры змяняліся часцей. Першым дырэктарам СДК была Л.М.Касюк. Пасля яе майстроў клубнай справы тут пабывала 13 чалавек. Ажно пакуль у дырэктарскі кабінет не трапіла Наталля Плеска. Такім чынам, вось ужо дзесяць гадоў яна запраўляе гэтай нялёгкай культурнай "кухняй". Паспяхае кіравачь і студыяй эстраднай песні, якая дзейнічае пры клубе.

Вядома, святочны настрой быў бы далёка не такім поўным і радасным, калі б на вечар у клуб не прыйшоў дырэктар райаграпрамтэхнікі С.Р.Раўнейка. Гэта да яго часцей за ўсё звяртаюцца па дапамогу работнікі СДК. І, як правіла, ад варот паварот ім ніколі не паказваюць. Прыйшлі на вечар, каб павіншаваць усіх прысутных з юбілеем, метадыст аддзела культуры Г.С.Махнач, інспектар па кадрах аддзела культуры С.У.Петравец. Яны прыйшлі не з пустымі рукамі – прынеслі ў якасці падарунка магнітафон.

Выступіў і павіншаваў усіх з юбілеем былы дырэктар райаграпрамтэхнікі М.В.Назаранка.

Глыбока кранулі сэрца віншаванні гасцей з Парасленскай сярэдняй школы, у прыватнасці, танцавальнага ансамбля пад кіраўніцтвам былой работніцы СДК В.С.Рыхліцкай і другакласнікаў са сваім класным кіраўніком Л.А.Калютай. А таксама выступленні вакальнай групы Сланімцоўскага клуба.

Вядома, шкада, што не ўсе з маючых адносіны да свята былі ў гэты вечар у зале. Здавала клуб і ўвогуле ўвесь гэты будынак у эксплуатацыю будаўнічая брыгада на чале з В.А. Дубінай.

Вялікае дзякуй былым работнікам Сонечнага СДК Л.В.Капоце, М.М.Несцяровіч, Г.Р.Ефімчук, якія павіншавалі нас цудоўнай песняй, былым удзельнікам ансамбля "Час", які дзейнічаў пры клубе, Івану Шваічко, Паўлу Юзафовічу, Юрыю Грышкевічу за іх спагадлівасць і памяць "пра той час".

Святлана БАГДАНОВІЧ, мастацкі кіраўнік Сонечнага СДК.

Душэўны парыў

БЫВАЮЦЬ ЦУДЫ НЕ ТОЛЬКІ Ў КАЗКАХ

ЦІ ВЕРЫЦЕ вы, дарагія чытачы, што цуд бывае не толькі ў казках, але і ў жыцці? Зусім нядаўна такі цуд падрыхтавалі настаўнікі і вучні Кляпацкай СШ, якія адзначалі дваццацігадовы юбілей школы. Што гэта было за свята, чарадзейную атмасферу якога цяжка перадаць словамі! Пачалося свята ў холе школы, ледзь змясціўшай усіх гасцей і ўдзельнікаў урачыстасці. Рыхтаваліся да яго загадзя, з вялікім натхненнем і энтузіязмам. Чысціні, мылі, упрыгожвалі класныя пакоі. На маляўнічых стэндах наглядна можна было пазнаёміцца з гісторыяй школы. Але галоўныя яе моманты былі адлюстраваны ў выступленнях былых і цяперашніх вучняў. З якой гордасцю, з якім хваляваннем гаварылі яны пра сваю школу з моманту яе адкрыцця і па сённяшні дзень, з якой любоўю вымаўлялі імёны сваіх настаўнікаў!

Пасля так званай уступнай часткі свята працягвалася ў мясцовым Доме культуры. Вось тут і адбывалася нябачнае, але такое адчувальнае, непадзельнае яднанне людскіх душ. Намеснік старшыні райвыканкома Іван Сяргеевіч Казарэз у сваім віншаванні адзначыў, што ў Кляпацкай школе ўзаемаадносіны настаўнікага калектыву з выхаванцамі будуюцца на добразычлівай і ў той жа час прынцыповай аснове, таму працэс выхавання і навучання тут прасякнуты глыбокай павагай і любоўю да дзяцей. Пад гарачыя апладысменты І.С.Казарэз уручыў школе каштоўны падарунак — музычны цэнтр. Прадстаўнік раённага аддзела адукацыі — спецыяліст-арганізатар РАА Міхаіл Міхайлавіч Беразюк у сваім цёплым, сардэчным выступленні падкрэсліў, што калектыву настаўнікаў Кляпацкай СШ уласцівы высокая патрабавальнасць, сумленны, рэальны погляд на рэчы, педагагічны пошук. Пажадаўшы юбілярам моцнага здароўя, шчасця і поспехаў ва ўсім, М.М.Беразюк таксама ўручыў калектыву каштоўны падарунак — чайны сервіз, а пяці настаўнікам, якія працавалі з дня заснавання школы, Ганаровыя граматы РАА і грашовыя прэміі. Бурнымі апладысментамі суправаджалі прысутныя віншавальную прамову былога дырэктара Кляпацкай школы, адзначанага вучнямі як самога строгага, але справядлівага дырэктара, Уладзіміра Васільевіча Абяргана — цяпер старшыні Мокраўскага сельскага Савета. Уладзімір Васільевіч уручыў школе падарунак мясцовай улады — магнітафон.

Незвычайна ўзрушанае выступленне першай выпускніцы школы Наталлі Анатольеўны Самасюк – цяпер намесніка дырэктара па пачатковых класах дзевятнаццатай брэсцкай сярэдняй школы — з'явілася сапраўды каштоўным падарункам, падарункам душы.

Вельмі цёпла павіншавалі школы калектыў дырэктар Кляпацкага Дома культуры Зінаіда Пятроўна Рошчанка, дырэктар Кляпацкай дзіцячай музычнай школы Жанна Мікалаеўна Раманюк. Квартэт выкладчыкаў гэтай школы на высокім прафесійным узроўні выканаў песню, выказаўшы ў ёй свае глыбокія пачуцці калегам. Свае вершы, надзвычай пяшчотныя, пакрытыя светлым смуткам і ціхай любоўю да настаўніка і школы, прачытала настаўніца Алена Васільеўна Каляда. А цудоўныя вершы, напісаныя настаўнікам Уладзімірам Рыгоравічам Чэрнікам, перадаючыя высокія пачуцці, пранікнёна прачытала былая выпускніца Алена Сяргееўна Чэрнік, глыбока крануўшы душэўныя струны слухачоў.

Нікога з прысутных у зале не пакінулі абыякавымі прыгожыя спевы ў гонар юбіляраў былога выпускніка школы Віталія Іванавіча Герасімовіча. Усіх павкарыла выступленне намесніка дырэктара школы Любові Іванаўны Аніська. Колькі гонару за сваіх калег і вучняў, колькі любові і пяшчоты да іх адчувалася ў яе трапятліва вымаўляемых словах!

У заключным слове дырэктар Кляпацкай школы Пётр Сяргеевіч Ліпніцкі павіншаваў сваіх настаўнікаў, вучняў і ўсіх прысутных з юбілеем, выказаў асабістае бачанне школы будучага, сваёй роднай школы. Гэта школа з камп'ютэрным аснашчэннем, тэлецэнтрам, плавальным басейнам. Школа будзе працаваць у перыяд новых спосабаў апрацоўкі інфармацыі. Але галоўнае — школа ператворыцца ў храм радасці, самасцвярджэння, росквіту і перамогі розуму.

Пасля ўрачыстай часткі вечара сцэну захапілі дзеці. Іх канцэрт, які яны дарылі настаўнікам, бацькам, гасцям — гэта Натхненне, Ісціна, Прыгажосць. Пералічыць усе выступленні немагчыма, але ўсе яны выдатныя. Магу з поўнай упэўненасцю і гордасцю за кляпацкіх дзяцей сказаць, што іх выступленне не ўступіць сталічным школам. А іх шчырае жаданне і імкненне падарыць радасць гледачам наогул не ідзе ні ў якое параўнанне.

За ўсёй гэтай прыгажосцю стаіць велізарная праца цудоўнага чалавека — намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце Зоі Мікалаеўны Абярган. Зоя Мікалаеўна сваёй работай, жыццём яшчэ раз пацвердзіла, што настаўнік павінен вучыць не толькі фізіцы, матэматыцы, літаратуры, але і радасці, шчасцю, таму што наша мэта, мэта настаўніка — рабіць людзей шчаслівымі.

Я ўдзячна лёсу за тое, што некалі на працягу трох год была звязана з калектывам настаўнікаў і вучняў Кляпацкай школы. І сёння, калі жыву і працую далёка ад іх, я ўсё роўна сэрцам у Клепачах.

Таццяна МІССА-КАВАЛЕВІЧ, настаўніца музыкі, г.Мінск.

ПОНЕДЕЛЬНИК, 12 ЯНВАРЯ

Белорусское телевидение

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Резонанс.
8.50 Телебарометр.
9.05 "Сегодня с вами..."
9.40 "Белый автомобиль", "Ральф, здравствуй!" Короткометражные худ. фильмы для детей.
10.35 "Индаба". Телесериал.
11.05 Здоровье. "Хлеб, соль... йод - вашему дому".
11.30 Бон тон. Тележурнал моды.
11.55 Бездельник.
12.25 "А музыка звучит..." Концерт.
13.00 Новости.
13.15 Дневной сеанс. "Зина-Зинуля". Худ. фильм.
14.40 Параграф. Передача для безработных.
15.00 Новости.
15.15 Видеокурс немецкого языка. Передача 19-я.
15.35 ТВ - школе. История Беларуси. 6-й класс. Религия и культура старобелорусских земель в X — XIII веках.
16.05 Мультфильмы.
16.30 Регион.
17.05 "Премьера". "Баллада о Свитязи". Док. фильм.
17.30 Гости в дом.
18.00 Новости (с сурдопереводом).
18.20 "Индаба". Телесериал.
18.55 Белорусский хит-парад.
19.00 "Сегодня с вами..."
19.40 Колыбельная.
20.00 Панорама.
20.55 "Смеяться - не грех". Развлекательная программа "Понедельник с "Христофором".
21.15 Фильмы нашей памяти. Худ. фильм "Семья как семья".
22.35 Третий тайм.
23.05 Белорусский дом.
23.35 Криминальная хроника.
23.55 Новости.
0.10 "Четверка нежданных нахлебников". 5-я серия.

ОРТ

17.00 Новости.
17.20 "Роковое наследство".
18.00 Погода.
18.05 Час пик.
18.30 Угадай мелодию.
19.00 Понедельник с Познером. Программа "Мы".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 Сериал "Полтергейст".
21.45 Док. детектив "Страдивари. Криминальное соло".
22.30 Худ. фильм "Амаркорд".

Канал "Россия"

17.05 Е.Яковлева, А.Пашутин и В.Стеклов в фильме "Плюмбум, или Опасная игра".
19.00, 23.30 Вести.
19.30 Подробности.
19.45 "Санта-Барбара".
20.50 Довгань-шоу.
21.20 Е.Дворжецкий и К.Козаков в телесериале "Графиня де Монсоро".
22.55 Национальный интерес.
23.25 Дежурная часть.
23.40 Чемпионат мира по водным видам спорта.
24.00 Авто-шоу.
0.25 Прогноз погоды.

КУЛЬТУРА

07.15, 13.00, 19.30, 23.00 Новости культуры.
07.35 Читая "Повести Белкина".
08.30 "Сатирический минисборник". Семен Альтов.
09.00, 11.00, 15.00, 17.00 Новости.
09.05 Образ жизни.
09.30 Телесуфлер.
09.45 Программа "Судьба и роли".
11.05 Портреты замечательных людей.
11.30 Программа передач.
11.45 Спектакль "Ханума".
14.30 Мир авиации. "Испытатель".
15.05 Сериал "Челленджерс".
15.30 Программа "Путешествие во времени".
16.15 Видеопоэзия. А.Ахматова.
16.25 "Лукоморье".
16.45 Киберкультура.
17.05 "2003". К 300-летию Санкт-Петербурга.
17.15 Международное обозрение.
17.45 "Сокровища Петербурга". "В тихой обители".
18.00 Фасады в кружеве балконов.
18.15 Док. фильмы "Хирург Вишневский", "Раиса Немчинская — артистка цирка".
19.15 Чудо-сказка.
19.50 Сериал "Геттисберг".
20.50 Программа "Шукшин и Трифонов: молчаливый диалог".
21.40 "Запечатленное мгновение..." Д.Хворостовский.
22.40 Ночной гость.

ВТОРНИК, 13 ЯНВАРЯ

Белорусское телевидение

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Новости.
8.15 "Сегодня с вами..."
9.05 ТВ - школе. История Беларуси. 6-й класс.
9.35 "Мультиклуб".
10.35 "Индаба". Телесериал.
11.10 Акколада.
11.40 "Беларусь". Киноальманах студии "Летопись".
11.55 Четвертое измерение.
12.25 Фильм-концерт.
13.00 Новости.
13.15 "С Новым годом!" Спектакль. 1-я часть.
14.40 "Макаенка, 9".
15.00 Новости.
15.15 ТВ - школе. Белорусская литература. 9-й класс. "Разговор с современниками". Пимен Панченко и его поэзия.
15.45 Накануне будущего.
16.30 Уроки Н.Новожиловой.
17.00 История в лицах. "Кирилл Туровский". Док. фильм.
17.25 Многоголосие. Народы Беларуси: история, культура, быт.
18.00 Новости (с сурдопереводом).
18.20 "Индаба". Телесериал.
18.55 Белорусский хит-парад.
19.00 "Сегодня с вами..."
19.40 Колыбельная.
20.00 Панорама.
20.55 "Смеяться - не грех". "Спикер-хата".
21.15 "Сеанс мой вечерний..." Худ. фильм.
22.10 Международные спортивные новости.
22.30 Музыка без границ.
23.00 "Колядные вечера".
23.05 КВН. Второй фестиваль белорусской лиги.
0.15 Новости.
0.30 "Четверка нежданных нахлебников". 6-я серия.

ОРТ

08.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.20 Новости.
08.15 "Роковое наследство".
09.00 Программа "Мы".
09.45 Смехопанорама.
10.20 Домашняя библиотека.
10.30 Угадай мелодию.
11.15 Программа "Вместе".
14.20 "Насекомусы".
14.55 Счастливый случай.
15.40 "Похищенный". Приключенческий сериал.
16.10 "...До шестнадцати и старше".
16.30 "Вокруг света".
